# НАШ АРХІЎ

## АЎТОГРАФ ЯНКІ ЖУРБЫ

У Дзяржаўным архіве Магілёўскай вобласці захоўваюцца два дакументы 30-х гадоў, што маюць непасрэднае дачыненне да аднаго з беларускіх пісьменнікаў нашаніўскай плеяды Янкі Журбы (Я.Івашына). Гэта ўласнаручна напісаная ім заява з просьбай прыняць у Магілёўскую секцыю навуковых працаўнікоў і анкета сябра гэтай арганізацыі.

Заява Я.Журбы напісана каліграфічным "настаўніцкім" почыркам фіялетавым чарнілам на двайным лісце са школьнага сшытка ў шырокую лінейку.

У Магілёўскую сэкцыю навуковых працаўнікоў
выкладчыка беларускай мовы і літаратуры
ў Магілёўскім мэдыцынскім палітэхнікуме
Я. Івашына.

Заява.

Я ведаю расійскую, беларускую і ўкраінскую мовы. Пісаў крытычныя нарысы аб творах беларускіх пісьменьнікаў. Гэтыя нарысы друкаваліся ў беларускіх газэтах і часопісях: "Полымя", "Савецкая Беларусь" і інш. У 1921 і 22 годзе я працаваў у якасьці члена навукова-пэдагагічнай камісіі пры Нар. Кам. Асьветы БССР.

Апроч гэтага я маю друкаваны зборнік сваіх твораў пад назвай "Заранкі". Другі зборнік маіх твораў пад назвай "Шляхі перамогі" мною падрыхтаваны да друку. Мае творы былі зьмешчаны ў многіх беларускіх чытанках для школ. Пісаць мастацкія творы прадаўжаю і ў сучасны момант.

Пры гэтым прыкладваю зборнік маіх твораў "Заранкі" і тры №№ газэты "Камунар Магілёўшчыны" за 1933 год, у якіх зьмешчаны мае навейшыя творы.

Беручы пад увагу вышэйпададзенае, прашу прыняць мяне ў лік членаў Магілёўскай сэкцыі навуковых працаўнікоў.

Мой адрас: Магілёў-Бел, вул. Дзекабрыстаў, 10, Я. Івашыну.

22 чэрвеня 1933 году. Я.Івашын (Я.Журба)[1]

На заяве простым алоўкам накладзена рэзалюцыя: "На пасяджэнне гарбюро. 29. VIII.33г. За старшыню... (подпіс нечытэльны – М.К.)."

А побач, на стандартнага памеру лісце ружовай паперы, – аддрукаваная на машынцы анкета. Запоўнена яна, відаць, самім паэтам, але з пэўнасцю сцвярджаць гэта цяжка. Папера тонкая, для машынапісу, чарніла на ёй расплывалася (некаторыя словы цяжка прачытаць без павелічальнага шкла), і характэрныя асаблівасці почырку скрадваюцца.

**Саюз працаўнікоў асьветы**
**Сэкцыя Навуковых Працаўнікоў Беларусі**

**Анкета**

**1. Прозьвішча, імя, імя па бацьку...** Івашын Янка Якубавіч
**2. Узрост ...** 42 гады.

---

[1] Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. – ф.927, вол.3, адз.зах. 2, л. 25-26.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**3. Нацыянальнасьць...** Беларус.

**4. Сацыяльнае паходжаньне...** Сын селяніна.

**5. Партыйнасьць...** Беспартыйны.

**6. Склад сям"і...** Жана, двое дзяцей і пляменьніца.

**7. Лік пакояў і кв. плошчы кватэры...** 1 пакой, плошча кватэры 25 кв. мэтраў.

**8. Хатні адрас...** Вул. Дзекабрыстаў, № 10.

**9. Сьпецыяльнасць...** Выкладчык бел. мовы і літаратуры.

**10. Займаемая пасада...** Настаўнік Магілёўскага

**11. Дзе працуе...** мэдыцынскага палітэхнікуму.[2]

**12. Кароткі жыцьцяпіс...** Нарадзіўся ў вёсцы Купніна Чашніцкага раёна. Скончыў настаўніцкую семінарыю і настаўніцкі інстытут. Працаваў 4 гады вясковым настаўнікам, па сканчэньні наст. інстытуту працаваў у выш. пачатк. школе 2 ст. і сямігодцы і апошнія 5 гадоў у мэдпалітэхнікуме.

**13. Ці вядзе навуковую працу і якую...**

1... Зараз не вяду.

**14.Пералік друкаваных прац – падрабязна – ...** Зборнік твораў "Заранкі", крытычныя нарысы аб творчасьці бел. пісьменьнікаў, зьмешчаныя ў часопісі "Полымя", у газэце "Савецкая Беларусь" і інш.

**15.Зьвесткі аб культпрацы:**

**а. Ці вядзеце культпрацу, апрача навучальных установ.**

**якую...** Зараз не вяду.

**б. Калі не, дык якую працу можа весьці у рабочых клюбах, лекцыі у акруговых гарадох і інш...** Магу рабіць даклады па белар. літаратуры, а таксама рабіць крытычны разбор твораў пачынаючых пісьменьнікаў.

**16.У якіх прафесіянальных і грамадзкіх органах прымае удзел...** У саюзе працасьветы, Асо-Авіяхім, Мопр, Чырвоны Крыж. Апроч гэтага зьяўляюся членам Саюза Сав. Пісьменьнікаў.

**17.Заработак, асноўная пэнсія, пабочныя даходы, заробак сяброў сям"і...** Мая асноўная пэнсія 200 руб., пабочныя даходы – ганарары за літаратурныя творы. Жана зарабляе 90 руб.

**18.Стан здароўя...** Здавальняючы.

**19.У якіх прафсаюзах быў раней да уступленьня у Саюз Белпрацасьветы...** Да ўступленьня ў Саюз Працасьветы ні ў якіх прафсаюзах ня быў.

**20.З якога часу у Саюзе і № сяброўскага білету...** У Саюзе Працасьветы з 1921 году. № сяброўскага білету 2463.

**Увага:**

**Подпіс:** Я.Івашын

**Дата запаўнення:** 27 чэрвеня 1933 г.[3]

Прыведзеныя вышэй дакументы маюць пэўную каштоўнасць перш за ўсё як матэрыял для вывучэння біяграфіі паэта і літаратурнага жыцця Магілёўшчыны. Побач з тым яны цікавыя і як адбітак жыцця краіны ў тыя часы.

Як вынікае з архіўных матэрыялаў, секцыя навуковых працаўнікоў Беларусі займалася правядзеннем культурна-асветніцкай працы. І складалася выключна з інтэлігенцыі: выкладчыкаў ВНУ і тэхнікумаў, настаўнікаў, урачоў, інжы-

[2] Так у анкеце. – М.К.

[3] Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. – ф.927, воп.3, адз.зах. 2, л. 27.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нераў, ветурачоў, работнікаў навукова-даследчых устаноў і г.д. Хаця гэта былі прадстаўнікі розных прафесій, працавала секцыя пад апекай прафсаюза асветы. Напэўна, як бліжэйшага па агульнаму накірунку дзейнасці, а не па прафесійных інтарэсах, абарона якіх тады з'яўлялася справай, скажам так, неактуальнай. Больш істотным было, відаць, тое, што праз прафсаюз асветы, апроч пытанняў культурна-асветніцкай працы, вырашаліся і чыста бытавыя праблемы – аздараўленне і лячэнне, а таксама – харчаванне членаў секцыі.Пры картачнай сістэме размеркавання, розніцы ў нормах забеспячэння гэта таксама было немалаважна.

*М.М. КАРАТКОЎ*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова